# Х х





















Ах! Ох! Ух! Эх!

ха
хо
ху
хі
хе



мех



хор



хаке́й



хурма́








У Белару́сі шмат хра́маў.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

| | | | |
|---|---|---|---|
| храм | хма́ра | хвілі́на | Хрысці́на |
| хлеб | хма́рка | хмуры́на | Хрысці́нка |

### Гульня́ «Рэ́ха»

Смех — мех, мех, мех.
Схапі́ць — піць, піць, піць.

Хма́ра — … .
Хва́ля — … .

## Хма́рка-кве́тка

На клу́мбе ў Хрысці́ны раслі́ ро́зныя кве́ткі. Яна́ пало́ла і паліва́ла іх. У во́льную хвілі́ну Хрысці́нка назіра́ла за хма́рамі.

Не́як ра́нкам Хрысці́на пры-кме́-ці-ла хмуры́нку, яка́я ўвесь час змяня́лася. Яна́ напаміна́ла то хрызантэ́му, то рамо́нак, то вало́шку. Гэ́тая хма́рка назіра́ла за кве́ткамі на клу́мбе і паўтара́ла іх абры́сы.



Хрысці́нка прыве́тна памаха́ла руко́й мало́й хма́рцы. Та́я набыла́ абры́с рукаві́чкі. Так хмуры́нка павіта́лася з Хрысці́нкай.

к й я ю е ё з в б ц ь ш х



Правообладатель Академия образования